# ІТАЛЬЯНСКІЯ АКЦЭНТЫ БЕЛАРУСКАЙ НЕАСХАЛАСТЫКІ

Лягчылін А.А., к.ф.н., дацэнт,
загадчык кафедры
філасофіі культуры ФФСН, БДУ;
Клімовіч Г.І., к.ф.н.,
ст. выкладчык кафедры
філасофіі і паліталогіі БДМУ

Беларуская неасхаластыка – феномен, які дагэтуль застаецца недаследаваным, нягледзячы на пэўную колькасць навуковых работ [3, 6, 7], прысвечаных дадзенай праблематыцы. Развіццё неасхаластычнай традыцыі на беларускіх абшарах – пытанне, якое не закранаецца ў айчыннай навуковай традыцыі ў дастатковай ступені. Тлумачыцца гэта ў першую чаргу дагэтуль пануючым у гістарычнай навуцы стэрэатыпам аб рэакцыйнай дзейнасці езуіцкага ордэна. Таксама незаўважнымі для гісторыкаў застаюцца цесныя сувязі дадзенай плыні з інтэлектуальнай спадчынай італьянскіх мысліцеляў, якія ўвасобіліся ў непасрэдным уплыве філасофскіх ідэй, а таксама магутным уздзеянні адукацыйных цэнтраў. Гэты дагэтуль незаўважаны, але досыць значны ўплыў дапамог выхаванню плеяды мысліцеляў, якія зараз складаюць цэнтральны ланцуг беларускай неасхаластычнай традыцыі. У свеце вышэйпазначанага мэта дадзенага артыкула – паказаць багацце і шматлікасць беларуска-італьянскіх сувязяў ў межах дадзенай тэматыкі.

У чым праяўлялася неасхаластычная традыцыя ў гісторыі беларускай рэлігійна-філасофскай думкі? Пад гэтай агульнай назвай можна аб’яднаць некалькі перыядаў існавання рэлігійнай філасофіі на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Звычайна, неасхаластыка – паняцце, якое выкарыстоўваецца ў якасці агульнага для розных напрамкаў рэфлексіі, якія ў той ці іншай ступені імкнуцца да рэстаўрацыі ідэй сярэднявечнай філасофіі. На Беларусі гэта з’ява характэрна адразу для некалькіх перыядаў, у якасці аб’екта дадзенага артыкула будуць разглядацца Полацкая неасхаластыка, а таксама спецыфічны тып неасхаластыкі, звязаны з росквітам неатамізму на беларускай гісторыка-культурнай прасторы ў XX ст. пад умоўнай назвай “Друйская неасхаластыка”.

**Першы этап. “Полацкая неасхаластыка”.** На беларускіх абшарах у апошняй чвэрці XVIII-пачатку XIX стст. назіраецца ўнікальны феномен – у гэты час дадзеная тэрыторыя заставалася амаль адзіным месцам у свеце, дзе захоўвае існаванне езуіцкі ордэн, пры гэтым асноўным інтэлектуальным яго цэнтрам з’яўляецца Полацк. Напрыклад, В.Ф Шалькевіч адзначае, што магчыма нават казаць аб існаванні асобнай школы ў айчыннай інтэлектуальнай традыцыі, якая мусіць мець назву “полацкая неасхаластыка”[6, с. 189]. Яе ідэалагічным ядром было вучэнне Фамы Аквінскага, а ў якасці аднаго з асноўных прадстаўнікоў магчыма ўзгадаць знакамітую постаць прафесара Вінцэнція Бучынскага (акрамя Полацка ён

выкладаў у Вене і Лувэне). На гэты час Полацкая Акадэмія, які і агульнавядомы Віленскі ўніверсітэт, стала вялікім інтэлектуальным цэнтрам, на вучобу ў які імкнулася патрапіць беларуская моладзь. Адбывалася гэта і дзякуючы шматлікім італьянскім педагогам, якія былі прадстаўлены тут даволі вялікай групай і выкладалі разнастайныя дысцыпліны. У якасці прыклада можна прывесці імёны наступных выкладчыкаў – А. Месараці, Б. Скардыяла (тэалогія), Дж. Маньяні (філасофія), матэматыка (Ю. Анджыаліні) [1, с. 161-163].

Найбольш цікавай асобай сярод вышэйпазначаных дзеячаў у межах тэматыкі дадзенага артыкула з'яўляецца Юзаф Анджыаліні (1747-1814), які займаў пасаду прафесара матэматыкі. Акрамя гэтага, ён выкладаў для вучняў філасофію, тэалогію і кананічнае права [9, с. 231]. Быў вядомы не толькі дзякуючы бліскучым ведам, але і маральным паступкам – так падчас вайны 1812 года ён даглядаў параненых жаўнераў [9, с. 232].

У 1819 г. у Полацку ў 2 тамах выйшаў твор Ю. Анджыяліні "Institutiones philosophicae ad usum studiosorum Academiae Polocensis", які з'яўляецца прыкладам еўрапейскай неасхаластыкі. Унікальнасць яго ў тым, што ўяўляе сабой спробу захавання сістэмы тамізму на еўрапейскіх абшарах, у той час як у іншых рэгіёнах у дадзены час яна падвяргалася паўсюднай крытыцы. На жаль, дагэтуль дадзены твор, напісаны на лацінскай мове, застаецца непрааналізаваным належным чынам. Ён з'яўляецца ўзорным падручнікам для студэнтаў Полацкай Акадэміі па навучанню філасофіі гэтага часу і складаецца з наступных частак: логіка, дыялектыка, метафізіка, анталогія, этыялогія, касмалогія [8].

Як вядома, першыя спробы вяртання да ідэй схаластычнай філасофіі, якая потым стане падмуркам магутнага руху неатамізму, адносяцца да сярэдзіны XIX ст. Яны звязаны з творчасцю такіх рэлігійных філосафаў, як М. Лібэраторэ (1810-1892), Х. Бальмес (1819-1847), І. Клейтген (1811-1881) [2, с. 3]. Трэба звярнуць увагу, што творчая спадчына Ю. Анджыаліні з'яўляецца першай спробай вяртання да дадзенай інтэлектуальнай традыцыі. Знаходзячыся пад уплывам Суарэса, ён адзін з першых пачаў пераасэнсоўваць праграмныя ўстаноўкі філасофіі Фамы Аквінскага. Дадзены факт дае некаторым даследчыкам падставу сцвярджаць, што менавіта на беларускіх абшарах – у Полацку ў працах Ю. Анджыаліні і з'явіўся пачатак еўрапейскай неасхаластычнай традыцыі. Таксама ў сувязі з гэтым можна казаць і аб спецыфічнай неасхаластычнай традыцыі Полацкай школы.

Такім чынам існуе тэорыя, згодна з якой менавіта Полацкая Езуіцкая Акадэмія была тым цэнтрам, у якім упершыню ў творчасці Ю. Анджыаліні былі сфармуляваны прынцыпы навяртання ідэй Фамы Аквінскага ў еўрапейскае філасофскае асяроддзе. Наступны перыяд развіцця дадзенай традыцыі, звязаны з узнікненнем і развіццём неатамізму на беларускай прасторы, таксама прасякнуты беларуска-італьянскімі сувязямі.

**Другі этап. "Друйская неасхаластыка".** Гэта ўмоўная назва азначае, што большасць мысліцеляў, якія належаць да памянёнага напрамку, у той ці

іншай ступені звязана з каталіцкім асяроддзем у Друі, якое ў XX ст. на працягу амаль дзесяці гадоў было аплотам сапраўднага беларускага каталіцызму. Дадзены этап таксама звязаны з італьянскім уплывам. Гэта феномен неатамістычнай традыцыі ў межах беларускай рэлігійна-філасофскай думкі, які некаторыя даследчыкі, у тым ліку і самі беларускія аўтары, таксама лічаць за лепшае называць неасхаластыкай [12, с. 8]. Асноўныя прадстаўнікі другога перыяду развіцця неасхаластыкі – Ф. Абрантовіч (1884-1946), Я. Тарасевіч (1892-1978), Л. Гарошка (1911-1977), Б. Пачопка (1884-1940), І. Бобіч (1890-1944), Я. Рэшаць (1890-1958), А. Станкевіч (1891-1949), Ч. Сіповіч (1914-1981), П. Татарыновіч (1896-1978). Трэба адзначыць, што творчасць дадзеных аўтараў была інспіравана ідэямі вялікага італьянскага мысліцеля – Вінцэнта Джоакіна Рафаэля Луіджы Печы, болей вядомага свету пад імём папы Льва XIII. Ен з’яўляецца адным з галоўных ідэолагаў руху неатамізму – найбольш моцнай і папулярнай плыні рэлігійнай філасофіі XX ст.

Плыня неатамізму, пакліканая да жыцця Львом XIII, з’явілася агульным ідэалагічным падмуркам, на якім паўстала шматлікая творчасць еўрапейскіх, у тым ліку і беларускіх аўтараў. У якасці прыклада мы можам назваць “Касцёл і навука”, “Бог”, “Чалавек” Ф. Абрантовіча, “Беларусы ў святле праўды”, “Зло і лякарства на яго” Я. Тарасевіча, “Навука і рэлігія”, “Паходжанне чалавека ў святле сучасных знахадкаў” Л. Гарошкі і іншыя.

Трэба адзначыць, што італьянскі ўплыў у межах дадзенага феномена не абмяжоўваўся толькі ідэалагічным напрамкам. Вялікую ролю ў станаўленні светапогляду беларускіх мысліцеляў адыграў Універсітэт Св. Фамы ў Рыме, адзін з пяці асноўных папскіх універсітэтаў, вядомы таксама пад назвай Angelicum. На той час з’яўляўся з разам з Лувэнскім універсітэтам і універсітэтам ва Фрэйбургу адным з галоўных цэнтраў распаўсюджвання і вывучэння ідэй неатамізму. У якасці alma mater яго згадвае беларускі каталіцкі інтэлектуал – Тамаш Падзява. Акрамя гэтага, з іншымі папскімі інстытутамі ў Рыме звязаны студэнцкія гады Ч. Сіповіча, П. Татарыновіча, а таксама А. Неманцевіча.

Італія таксама стала другой радзімай для беларускіх каталіцкіх аўтараў пасля неверагодных гадоў пакут, звязаных з рэпрэсіямі з боку савецкага ўрада. Не вытрымаўшы цяжару канцэнтрацыйных лагероў, жорсткіх умоў высылак, некаторыя з беларускіх рэлігійных дзеячаў загінулі, іншыя вымушаны былі стаць эмігрантамі. У гэты выпрабавальны для беларускай рэлігійнай думкі перыяд Італія стала тым месцам, якое падтрымала надалей развіццё інтэлектуальнай традыцыі, што пачала распаўсюджвацца пад сусветным уплывам на Беларусі. Увасобілася гэта ў адной з найбольш адметных для беларускай рэлігійна-філасофскай думкі падзей. Менавіта на італьянскіх землях бярэ пачатак адно з найбольш вядомых беларускіх эміграцыйных выданняў – газэта “Зьніч”. На працягу яе існавання з 1950 па 1980 гг. яе нязменным рэдакатарам быў а. Пётр Татарыновіч, а ў якасці рэдакцыйнага адрасу пазначаецца наступны: Roma, v. Corsica 1.

Генеральнай лініяй свайго існавання часопіс адзначаш наступныя прынцыпы: злучэнне беларускіх эміграцкіх мас вакол выдання, азнаямленне чытачоў з апошнімі з'явамі палітычнага і культурнага жыцця, якія паўставалі ў лоні хрысціянскай царквы. Сам П. Татарыновіч адзначаючы факт выйсця першага нумару "Зьніча", дадае, што саму назву трэба трактаваць у трох аспектах: філасофскім, тэалагічным і містычным. З пункту гледжання тэалагічнага аспекту часопіс можа разглядацца як Зніч веры: "ад веры інтуітыўна вытужанай у старасветных гаёх святарных праз нашых першабытна рэлігійных прашчуроў, первы пахрысціянску пасля набытай, крыжаваннем мучаніцтва замацаванай праз бацькоў нашых, шчыра шукаючых Дабра Праўды і Гожасці поўнадасканалай" [11, с. 1].

Адразу трэба адзначыць заўважаны тут прынцып гістарычнай паслядоўнасці, характэрны для неатамізму. П. Татарыновіч не адмаўляецца ад дахрысціянскіх часоў, бачачы ў іх натуральную повязь з наступным хрысціянскім перыядам, а таксама прыроджаную неабходнасць веры ў беларусаў. Пры жаданні можна правесці гістарычную паралель. Вядома, што некаторыя першыя хрысціяне не адмаўляліся ад здабыткаў старажытнагрэцкай філасофіі: напрыклад, Клімент Александрыйскі і Іустын Філосаф сцвярджалі, што хрысціянінам да Хрыста можна лічыць Сакрата. Дадзеная тэндэнцыя заўважаецца і ў больш позні перыяд, але ў больш завуаляваным варыянце. Так, вяртаючыся да італьянскай культуры, варта адзначыць сусветны шэдэўр, які належыць Дантэ Аліг'еры "Боская камедыя", дзе, як мы памятаем паганскія філосафы – Сакрат, Платон, Арыстоцель і іншыя, знаходзіліся ў Лімбе. Магчыма, нешта такое, але ў больш пашыраным выглядзе назіраецца і ў разважаннях П. Татарыновіча.

У філасофскім аспекце "Зніч веды" мае крыніцай Абсалют і, як відавочна, таксама звязаны з паняццем веры: "зьніч веды ўзяўшае свій пачатак з веры ў творчы лад Прамудрасьці, веды, здароджанай з культу Усёпрынцыпу, пакаленнямі чэрпанай з аліўнае лампады Першасвятла, што асвячае кожнага чалавека на свет прыходзячага" [11, с. 1].

Этычны аспект мае мэтай дасягненне еднасці з Абсалютам: "Зьніч жыццялюбові – дзейнатворчага згарання, палымення, самааддаанасці, шчаснаслужбы. Таму, што найдаражэйшае, найсвяцейшае, што ёсць Боствам нашага сэрца і розуму" [11, с. 1].

Такім чынам, можна заўважыць пэўны шлях развіцця ад веры праз веду да любові. Аб важнасці дадзенага прынцыпу ў рэфлексіі надалей адзначае і сам П. Татарыновіч: "Во – значэнне і засяг назву нашай часопісы. У ім азначаны і генеральныя лініі ейнага кірунку і характару: кансэрвацыя й навукова-літаратурная папулярызацыя дэпазыту веры і хрысціянска-маральнага ды ідэйна-культурнага жыцця ў нашых абставінах, абрадавых формах і мове, для нашых адраджэнскіх патрэбаў" [11, с. 1].

Рым аказался адным з найбольш плённых перыядаў у жыцці П. Татарыновіча. Акрамя выдання газэты "Зьніч" У Рыме быў выдадзены малітоўнік "Голас Душы", "Сьвятыя Эванэліі і апостальскія дзеі", пераклад

Г. Сенкевіча “Quo Vadis”. Таксама захавалася і італьянская спадчына дадзенага аўтара: La Santissima Yergine Immacolata ё Tispiratrice deli' unitś Cristiana in Biancorułenia,Academia Mariana lnternacionalis,Romae,1957,pp. 247-249. - La crocefissione delia fede e deiranima Cristiana Biancorutena,Palestra del Clero,fasc. n. 18,Settembre, 1954. [5, c. 21].

Трэба адзначыць, што на старонках дадзенага часопіса быў надрукаваны тэалагічна-філасофскі нарыс яшчэ аднаго славутага беларуса, які меў моцныя сувязі з італьянскай культурай – Ч. Сіповіча пад крыптонімам В.Д. (скарочанае ад Васіль Друя). Гэта творы “Бог” і “Душа”. На старонках першага у згоднасці з папулярным накірункам заходнееўрапейскай рэлігійнай філасофіі – неатамізмам – разглядалася пытанне аб існаванні Абсалюта. Аўтар адзначае, што ў адносінах да гэтага пытання існуе як мінімум тры адказы: фідэістычны, рацыянальны і агнастычны:

“Адзін кажа: я веру, што ёсць Бог, але не магу даказаць гэта другому, не маю для гэтага доказаў. Гэта будзе адказ веруючага хрысціяніна. Гэта вера не будзе абапірацца на разумных довадах, толькі на ўнутраных пачуваннях, гэта будзе вера пачуццёвая. Ейнай крыніцай ня ёсць розум, але толькі сэрца. Людзі з такой верай – лёгкадумныя. Лёгка пападаюць пад бязбожныя ўплывы. Другі зноў кажа: я ня толькі веру ў Бога. Я пэўны, маю на гэта многа доказаў. Гэта будзе адказ хрысціян ідэйна свядомых. Такая вера ёсць ня толькі пачуццёвай, але і разумнай. Ейнай крыніцай – і сэрца, і розум. І сапраўды, найбольшыя вучоныя свету верылі ў Бога і былі практыкуючымі хрысціянамі, маліліся, карысталіся з сакрамантаў. Вось некалькі важнейшых вучоных: Св. Альберт Вялікі, Ампер, Бэкон, Дэкарт, Ньютон і безліч іншых.
Трэці зноў кажа: не веру ў Бога. Хто яго калі бычыў, дзе ён? Гэта будзе адказ бязбожнікаў, якія не разумеюць гэтай праўды. Яны бо знайшлі сабе другіх багоў, або так выкрывілі бязбожнай агітацыяй свае погляды, што ім нельга ужо ўбачыць праўду над сабою. Такія людзі відзяць рэчы і пастýпкі і адчуваюць так, як дамагаюцца іхнія звычайныя погляды і пажаданні, а не так, як дамагаецца сапараўднасць” [10, с. 6].

Пасля гэтага аўтар пераходзіць ужо непасрэдна да разгляду доказаў існавання Абсалюта. Трэба адзначыць, што дадзеная тэма з’яўляецца адной з вызначальных для неатамізму, які атрымаў яе ў спадчыну яшчэ з твораў Фамы Аквінскага. Знакаміты прынцып Fides et ratio прывёў к неабходнасці ўведзення рацыянальных канцэптаў у вобласць трансцэндентальнага. Адной з праяў дадзенай тэндэнцыі і была папулярызацыя рацыянальных доказаў існавання Абсалюта. Акрамя рацыянальных Ч. Сіповіч разглядае таксама маральныя, гістарычныя і доказы са Св. Пісання. Цікава, што непасрэдна вера без разумовага тлумачэння стаіць для Ч. Сіповіча на нішэйшай ступені ў адносінах да “разумовай веры”. Ён адзначае: «Людзі, асабліва інтэлегенцыя, звычайна не развіваюць свайго роду эвалюцыі, або развіцця веры ў Бога. Змаладу ён верыць так, як маці вучыла, верыць толькі пачуццям. А калі розум ягоны пачынае даспяваць, прыходзяць сумнівы, вера слабее”. Цераз

нейкі час пасля, калі ён сапраўды паразумнее, тады зноў вяртаецца да веры, з той аднак розніцай, што зараз яго вера ўжо будзе разумная” [10, с. 6].

Таксама з Італіяй часткова звязаны і лёс іншага беларускага прадстаўніка неатамістычнай плыні – Тамаша Падзявы. Як ужо адзначалася раней, непасрэдны італьянскі ўплыў прасочваецца ў яго жыцці ў адукацыйным аспекце. Менавіта ў Рыме ён атрымаў ступень доктара філасофіі. Таксама вялікае значэнне для беларускай гісторыі і культуры меў праведзены ім год у Рыме пасля ссылкі (1969). Як адзначаюць яго калегі і сябры, сам ён узгадваў гэты год з надзычайнай цеплыней: «ён добра пазнаў Рым у часы свайго студэнцтва і ўмеў цаніць яго і любіць яго старадаўнасці і красу, як мала хто іншы” [4, с. 9]. У гэты год у Рыме ён атрымаў з рук кардынала дэ Фюрстэнберга залаты крыж (адна з вышэйшых узнагарод для беларускіх святароў), тут жа і сустрэўся з Анріё Бріні – архыепіскапам, які курыраваў дзейнасць Усходніх Цэркваў. Час, праведзены ў Рыме, даў яму магчымасць асэнсаваць жыццёвыя планы і натхніў на далейшую працу на карысць Беларусі – менавіта тут ён вырашыў ехаць у Лондан, дзе потым вёў казанні на беларускай мове, рыхтаваў перадачы для радыё Ватыкан .

Такім чынам, як бачна з ўсяго вышэйсказанага, у беларускай неасхаластыцы беларуска-італьянскія сувязі мелі моцны патэнцыял, беларуская і італьянская культура ўзбагачаліся дзякуючы ўзаемным уплывам, якія ўвасабляліся ў ідэйным, а таксама ў асветніцкім аспектах.

На дадзены момант пытанне наяўнасці беларуска-італьянскіх узаемасувязяў з’яўляецца відавочным, але яго распрацоўка яшчэ непачатая і можа быць ахарактарызавана як зародкавы стан. Ёсць станоўчыя з’явы: напрыклад, у Рыме была праведзена канферэнцыя, прысвечаная творчасці Ф. Абрантовіча. Але негатыўных момантаў больш. Дагэтуль застаецца ў цені гісторыі імя Ю. Анджыаліні. Нягледзячы на шматлікія згадкі, яго працы не перакладзены з лацінскай мовы, не прааналізаваны ў дастатковай ступені, і гэта ўлічваючы яго вялікі ўнёсак не толькі ў беларускую, але і ў еўрапейскую філасофію. Недзе ў адной з бібліятэк Рыма знаходзіцца дысертацыйнае даследаванне Яна Тарасевіча “Пакора ў святле вучэння Фамы Аквінскага”, дагэтуль недасяжнае для беларускіх навукоўцаў. Непрааналізаванымі ў дастатковай ступені з’яўляюцца італьянска-беларускія сувязі сярод прадстаўнкоў беларускай неатамістычнай традыцыі. Чакае педагагічная спадчына італьянскіх выкладчыкаў Полацкай Акадэміі. Такім чынам, дадзены артыкул з’яўляецца спробай праблематызацыі дадзенага пытання, якое чакае далейшых высілкаў і намаганняў з боку як італьянскіх, так і беларускіх навукоўцаў.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС


1. Инглот, М. Общество Иисуса в Российской Империи и его роль в повсеместном восстановлении Ордена во всем мире / М. Инглот. – М.: Ин-т философии, теологии и истории св. Фомы, 2004. – 632 с.
2. Кирьянов, Д.В. Томистская философия XX века / Д.В. Кирьянов. – Спб. : Алатейя, 2009. – 169 с.
3. Серабракоў, З. Філязофія Акадэміі езуітаў у Полацку – Ражым доступу: http://www.epolotsk.com/page.php_id=251.html. Дата доступу: 10.10.2016.
4. Сіповіч, Ч. Айцец Тамаш Падзява / Ч. Сіповіч // Божым шляхам. – 1975. – № 145-146. – С. 8-10.
5. Сіповіч, Ч. Пралат Пётр Татарыновіч / Ч. Сіповіч // Божым шляхам. – 1979. – № 150. – С. 19-25.
6. Шалькевіч, В.Ф. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / В.Ф. Шалькевіч. – Мінск, 2002. – 247 с.
7. Шалькевіч, В.Ф. Полоцкая неасхаластыка / В.Ф. Шалькевіч // Мировоззренческие и философско-методологические основания развития современного общества: Беларусь, регион, мир. Под ред. Т.А. Адуло. – Минск, 2008. – С. 524-525.
8. Angiolini, G. Institutiones philosophicae ad usum studiosorum Academiae Polocensis / G. Angiolini. – Polock, 1819. – 450 S.
9. Darowski, R. Giuseppe (Joseph) Angiolini, SJ (1747-1814) professor of philosophy at the Polotsk Academy. – Ражым доступу: http://lib.psu.by/history/Files/darowski.pdf. Дата доступу: 10.10. 2016.
10. Sipovič, Č. Boh / Č. Sipovič // Znič. – 1950. – № 1. – S. 6-8.
11. Tatarynovič, P. Ustup / P. Tatarynovič // Znič. – 1950. – № 1. – S. 1.
12. Z katalickaha žyccia ŭ Francyi // Chryścijanskaja dumka. – 1929. – № 2. – S. 8.